Галіна Хадасевіч, метадыст
упраўлення вучэбна-метадычнай
работы акадэміі паслядыпломнай адукацыі

# ФРАНКАФОНІЯ ЯК ПРЭСТЫЖ

Настаўнік замежнай мовы… У Рэспубліцы Беларусь навучэнцы вывучаюць пяць замежных моў: англійская, нямецкая, французская, іспанская і кітайская.

Менавіта аб вывучэнні фрацузскай мовы пойдзе гаворка: з 15 па 16 лістапада бягучага года ў акадэміі паслядыпломнай адукацыі адбыўся франка-беларускі семінар для дырэктараў і каардынатараў, настаўнікаў і выкладчыкаў вучэбных устаноў двухмоўных франкафонных секцый.

Удзельнічалі прадстаўнікі Пасольства Францыі ў Рэспубліцы Беларусь начале са спадаром Дзідзье КАНЭССАМ, Паслом Францыі ў Рэспубліцы Беларусь, Манастырным Андрэям Пятровічам, рэктарам дзяржаўнай установы адукацы “Акадэмія паслядыпломнай адукацыі”. Працаваў з настаўнікамі і каардынатарамі лектар з Францыі спадар Жульен Кардон, эксперт-метадыст Міжнароднага цэнтра педагагічных даследванняў. Прысутныя удзельнічалі ў інавацыйным працэсе па выкладанню французскай мовы для падлеткаў у форме майстар-класаў. Спадар Жульен Кардон застаўся задаволены працай беларускіх настаўнікаў.

Адбылася прэзентацыя дакладаў аб становішчы і перспектывах развіцця для кожнай франкафоннай секцыі. Абмяркоўваўся аналіз работы франкафонных двухмоўных секцый за 2017/2018 навучальны год: работа па ўдасканаленню прафесіянальных кампетэнцый педагагічных кадраў; павышэнне якасці адукацыйнага працэсу; пазакласная работа, накіраваная на павышэнне матывацыі да вывучэння французскай мовы. Мэта семінару — прэстыжнасць французскай мовы да навучання ў двухмоўных секцыях.

Згодна традыцыі, ў лістападзе, пры правядзенні семінара прысутных запрашае на прыем спадар Дзідзье КАНЭСС, Пасол Францыі ў Рэспубліцы Беларусь. З задавальненнем Пасол Францыі і Ксавье Ле Торывеллек, аташэ па супрацоўніцтву ў галіне сярэдняй і вышэйшай адукацыі Пасольства Францыі ад імя Міністэрства Францыі ўручаны ўзнагароды “Знак якасці” дырэктарам сярэдняй школы № 15 г.Брэста і гімназій № 9 г.Віцебска, № 1 г.Наваполацка (Віцебская вобласць) і № 1 г.Салігорска (Мінская вобласць).

Падчас франка-беларускага семінару ў акадэміі прымалі ўдзел карэспандэны АНТ і іншых сродкаў масавай інфармацыі. Спасылкі:

http://www.belrynok.by/2018/11/19/kak-zainteresovat-detej-uchitsya/

https://ont.by/news/srazu-chetyre-belorusskie-shkoly-udostoeny-znaka-otlichiya-minobrazovaniya-francii

У акадэміі паслядыпломнай адукацыі з 19 па 21 лістапада адбыўся Міжнародны конкурс аратарскага майстэрства для вучняў старэйшых класаў па авалоданню замежных моў “Сіла слова”. Колькасць удзельнікаў склала 74 вучні. Першае месца занялі тры пераможцы, з ліку якіх – вучаніца французскай мовы ЧУБО Елізавета, сярэдняя школа № 15 г.Брэста.

Настаўніцы Карнеевай Ірыне Аляксандраўне ўручана падзяка за прафесійны і творчы падыход у падрыхтоўцы да Міжнароднага конкурса.

У добры шлях, дарагія сябры, апантаныя да вывучэння французскай мовай!